# Марфалогія
# і арфаграфія

# Назоўнік

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс канчаткаў назоўнікаў 1-га скланення

| Склоны | Канчаткі назоўнікаў з асновай на зычны | | |
|---|---|---|---|
| | цвёрды | зацвярдзелы | мяккі |
| Н. | -а | -а | -я |
| Р. | -ы | -ы | -і |
| Д. | -е | -ы | -і |
| В. | -у | -у | -ю |
| Т. | -ой (-ою) | -ой (-ою) | -ёй (-ёю) |
| М. | -е | -ы | -і |

**У давальным і месным склонах назоўнікі 1-га скланення маюць наступныя канчаткі:**

***-е* – пры аснове назоўніка на цвёрды зычны і на [г], [х], якія чаргуюцца з [з’], [с’]:**

***краін-е – у краін-е, наз-е – на наз-е, страс-е – на страс-е***

***-і* – пры аснове на мяккі зычны:**

***песн-і – у песн-і, сям’і – у сям’і***

***-ы* – на зацвярдзелы зычны і на [к], які чаргуецца з [ц]:**

***груш-ы – на груш-ы, рэчц-ы – на рэчц-ы (з націскам на аснове)***

***-э* – пры аснове на [к], які чаргуецца з [ц]:**

***руц-э – у руц-э (націск падае на канчатак)***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Змяненне асабовых назоўнікаў 2-га скланення

| Склоны | Канчаткі назоўнікаў з асновай на зычны | | | |
|---|---|---|---|---|
| | цвёрды | зацвярдзелы | мяккі | [г], [к], [х] |
| Н. | □ | □ | □ | □ |
| Р. | -а | -а | -я | -а |
| Д. | -у | -у | -ю | -у |
| В. | -а | -а | -я | -а |
| Т. | -ам, -ом | -ам, -ом | -ем, -ём | -ам, -ом |
| М. | -е | -у | -ю | -ю |

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення ў родным склоне

**Канчатак -а (-я)**
***маюць большасць канкрэтных назоўнікаў:***
*сусед-а, тыдн-я*

**Канчатак -у (-ю)**
***маюць некаторыя назоўнікі мужчынскага роду:***

***– назоўнікі са зборным значэннем:***
*люд-у*
*бярэзняк-у*
*фальклор-у*
*бэз-у*
*га-ю*

***– назвы з'яў прыроды:***
*туман-у*
*сухаве-ю*
*даждж-у*
*холад-у*
*іне-ю*

***– рэчыўныя назоўнікі:***
*кісларод-у*
*лёд-у*
*метал-у*
*але: хлеб-а, аўс-а*

***– абстрактныя назоўнікі:***
*сорам-у*
*бол-ю*
*блакіт-у*
*ідэал-у*
*лес-у*

***– назвы дзеянняў:***
*падыход-у*
*крык-у*
*запіс-у*
*пад'ём-у*

***– прасторавыя і часавыя паняцці:***
*захад-у*
*кра-ю*
*стэп-у*
*час-у*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення ў месным склоне

**У месным склоне назоўнікі 2-га скланення маюць канчаткі:**

**Канчатак -е**
***пры аснове на цвёрды зычны і [г], [х], якія чаргуюцца з гукамі [з'], [с']:***
***на неб-е, на бераз-е, у горадз-е***

**Канчатак -ы**
***пры аснове на зацвярдзелы:***
***у шалаш-ы, на дождж-ы***

**Канчатак -і**
***пры аснове на мяккі зычны:***
***у студзен-і, на кан-і***

**Канчатак -у**
***назоўнікі з асновай на [к] і на [г], [х], якія не чаргуюцца з гукамі [з'], [с']:***
***у пяск-у, на сцяг-у***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс канчаткаў назоўнікаў 2-га скланення ў месным склоне

**У месным склоне асабовыя назоўнікі маюць канчаткі:**

**Канчатак -е**

***пры аснове на цвёрды зычны :***

***аб рыбалов-е, пры брац-е***

***але: пры дзед-у***

**Канчатак -у**

***пры аснове на зацвярдзелы і на [г], [к], [х] :***

***пры камандзір-у, геолаг-у, будаўнік-у, пастух-у***

**Канчатак -ю**

***пры аснове на мяккі зычны:***

***пры вучн-ю, аб геро-ю***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс канчаткаў назоўнікаў 3-га скланення

**У родным, давальным і месным склонах адзіночнага ліку назоўнікі 3-га скланення маюць аднолькавыя канчаткі:**

**-і – пасля асноў на мяккі і цвёрды зычны:**

- *да прыстан-і, верф-і; к прыстан-і, верф-і; на прыстан-і, верф-і*

**-ы – пасля асноў на зацвярдзелы зычны:**

- *да печ-ы, к печ-ы, на печ-ы*

**У творным склоне:**

**-у – пры аснове на зацвярдзелы зычны**

- *печч-у, мышш-у*

**-ю – пры аснове на мяккі, цвёрды і зацвярдзелы [р]:**

- *дэталл-ю, любоў-ю, Сібір'-ю*

**Зычны ў канцы асновы, калі стаіць пасля галоснага, падаўжаецца і на пісьме перадаецца дзвюма літарамі:**

***Нарачч-у, сенажаць-ю, столл-ю, меддз-ю***

**а пасля зычнага не падаўжаецца:**

**свежасц-ю, маладосц-ю**

**Пасля губных і *р* у творным склоне пішацца апостраф:**

***глыб'ю, шыр'ю, верф'ю***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс канчаткаў назоўнікаў у множным ліку

| Склоны | 1-е скланенне | | 2-е скланенне | | 3-е скланенне | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Н. | *сцен-ы* | *земл-і* | *воч-ы* | *кавал-і* | *вобласц-і* | *печ-ы* | *верф-і* |
| Р. | *сцен* | *зямель*<br>*земл-яў* | *вач-эй* | *кавал-ёў* | *абласц-ей* | *пяч-эй*<br>*печ-аў* | *верф-яў*<br>*верф-ей* |
| Д. | *сцен-ам* | *земл-ям* | *вач-ам* | *кавал-ям* | *абласц-ям* | *печ-ам* | *верф-ям* |
| В. | *сцен-ы* | *земл-і* | *воч-ы* | *кавал-ёў* | *вобласц-і* | *печ-ы* | *верф-і* |
| Т. | *сцен-амі* | *земл-ямі* | *вач-амі*<br>*вач-ыма* | *кавал-ямі* | *абласц-ямі* | *печ-амі* | *верф-ямі* |
| М. | *(на) сцен-ах* | *земл-ях* | *(аб)вач-ах* | *(аб) кавал-ях* | *(у) аблас-ях* | *(у) печ-ах* | *(на) верф-ях* |

**У назоўным склоне множнага ліку назоўнікі маюць канчаткі -ы, -і:**
***брат-ы, песн-і***
**але з асновай на -амін – -е:** ***мінчан-е***

**Канчаткі вінавальнага склону неадушаўлёных назоўнікаў множнага ліку супадаюць з канчаткамі назоўнага склону:**
***паліваць кветк-і, будаваць завод-ы***
**адушаўлёных назоўнікаў – з канчаткамі роднага склону:**
***узнагародзіць будаўнік-оў, вітаць калгасніц***

**У творным склоне назоўнікі маюць канчатак -амі (-ямі)**
***сцен-амі, кавал-ямі***
**некаторыя могуць ужывацца з канчаткам -мі, перад якім пішацца ь:**
***конь-мі і кан-ямі, слязь-мі і сляз-амі, касць-мі і касц-ямі***

# Скланенне назоўнікаў, якія абазначаюць назвы маладых істот

| Склоны | Адзіночны лік | | Множны лік | |
|---|---|---|---|---|
| **Н.** | *ягн-я (-ё)* | *дзіц-я (-ё)* | *ягнят-ы* | *дзец-і* |
| **Р.** | *ягняц-і* | *дзіцяц-і* | *ягнят* | *дзяц-ей* |
| **Д.** | *ягняц-і* | *дзіцяц-і* | *ягнят-ам* | *дзец-ям* |
| **В.** | *ягн-я (-ё)* | *дзіц-я (-ё)* | *ягнят* | *дзяц-ей* |
| **Т.** | *ягн-ём* | *дзіц-ём* | *ягнят-амі* | *дзець-мі* |
| **М.** | *(на) ягняц-і* | *(пры) дзіцяц-і* | *(на) ягнят-ах* | *(пры) дзец-ях* |

***У родным, давальным і месным склонах адзіночнага ліку назоўнікі – назвы маладых істот маюць суфікс -яц- і канчатак і:***

***парасяц-і, зубраняц-і***

***у астатніх склонах гэтага суфікса няма.***

***Ва ўсіх склонах множнага ліку вышэйназваныя назоўнікі маюць суфікс -ят- (апроч назоўніка дзеці).***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Скланенне назоўнікаў агульнага роду

| Склоны | Націск на канчатку | Націск на аснове | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | мужчынскі і жаночы род | мужчынскі род | | жаночы род | |
| Н. | *сірат-а* | *задавак-а* | *ціхон-я* | *задавак-а* | *ціхон-я* |
| Р. | *сірат-ы* | *задавак-і* | *ціхон-і* | *задавак-і* | *ціхон-і* |
| Д. | *сірац-е* | *задавак-у* | *ціхон-ю* | *задавац-ы* | *ціхон-і* |
| В. | *сірат-у* | *задавак-у* | *ціхон-ю* | *задавак-у* | *ціхон-ю* |
| Т. | *сірат-ой (-ою)* | *задавак-ам* | *ціхон-ем* | *задавак-ай* | *ціхон-яй* |
| М. | *(аб) сірац-е* | *задавак-у* | *ціхон-ю* | *задавац-ы* | *ціхон-і* |

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс суфіксаў назоўнікаў

**Суфікс -ак- пішацца:**
***калі пры змене назоўніка галосны ў суфіксе выпадае:***
***беражочак – беражочка, дзянёчак – дзянёчка***

**Суфікс -ык- пішацца:**
***калі пры змене назоўніка галосны ў суфіксе не выпадае:***
***ножык – ножыка, дождж**ык** – дождж**ыку*****

**Суфікс -ачк- пішацца:**
***пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных:***
***рэчачка, ножачка***

**Суфікс -ечк- пішацца:**
***пасля мяккіх зычных:***
***стрэмечка, Манечка***

**Мяккі знак пішацца:**

***– пасля мяккага н’ перад суфіксамі -чык- і -к-:***
***корань – карэньчык, дзень – дзянькі, вішня – вішанька***

***– пасля л перад суфіксамі -чык- і -шчык:***
***вугаль – вугольчык, вузел – вузельчык, палец – пальчык, вугаль – вугальшчык***

***– у суфіксах -аньк-, -еньк:***
***крынічанька, зязюленька***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс складаных назоўнікаў

**РАЗАМ ПІШУЦЦА**

- назоўнікі, у якіх асновы звязаны пры дапамозе злучальных галосных:
- *Навапалацк, краявід, Верхнядзвінск, краязнаўства*

**РАЗАМ ПІШУЦЦА**

- назоўнікі, першай часткай якіх з'яўляюцца словы аўта-,электра-, вела-,
- авія-, фота-, кіна- і інш.
- *аўтабаза, велагонкі, авіяпошта, фотавітрына, кінатэатр*

**РАЗАМ ПІШУЦЦА**

- назоўнікі, у склад якіх уваходзяць словы скора, лёгка, дарма, многа, мала і інш.:
- *скараход, цяжкаатлет, дармаед, мнагазначнасць*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс складаных назоўнікаў

**ПІШУЦЦА ПРАЗ ЗЛУЧОК**

- **складаныя прозвішчы:**
- *Дунін-Марцынкевіч, Лада-Забалоцкі*

**ПІШУЦЦА ПРАЗ ЗЛУЧОК**

- **складаныя геаграфічныя назвы:**
- *Камянец-Падольскі, Буда-Кашалёва*

**ПІШУЦЦА ПРАЗ ЗЛУЧОК**

- **некаторыя назоўнікі, утвораныя з двух слоў без злучальнай галоснай:**
- *генерал-лейтэнант, школа-інтэрнат, плашч-палатка*

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ

# Правапіс **НЕ (НЯ), НІ** з назоўнікамі

**Не (ня) пішацца разам:**

– калі без ***не (ня)*** назоўнік не ўжываецца:

***недахоп, непагадзь, нянавісць, няўмека***

– калі вытворны назоўнік з ***не (ня)*** можна замяніць словам без ***не***:

***непрыяцель (вораг), няпраўда (хлусня)***

**Часціца не пішацца асобна,**

калі ў сказе выражаецца супрацьпастаўленне або адмаўленне чаго-небудзь:

***Не доктар, а дрэвы лечыць. (Загадка)***

***Адзін у полі не воін. (Прыказка)***

***Не агонь, а пячэцца. (Загадка)***

**Часціца ні з назоўнікамі пішацца асобна:**

***Ні стуку, ні груку – госць на дварэ. (Загадка)***

***Нідзе ні шуму, ні трывогі.***

ПЕРСПЕКТИВНАЯ ШКОЛА
К ПЕРВЫМ ПРИХОДЯТ ЛУЧШИЕ